Учреждение образования «Барановичский государственный университет»

# Вестник БарГУ

**Ежеквартальный научно-практический журнал**

Издаётся с марта 2013 года
Выходит 2 раза в год

№ 1 (11), январь, 2022

Серия «Педагогические науки. Психологические науки. Филологические науки (литературоведение)»

*Учредитель*: учреждение образования «Барановичский государственный университет».

*Адрес редакции:*
ул. Войкова, 21, 225404 г. Барановичи.
Телефон: +375 (163) 64 34 77.
E-mail: vestnik@barsu.by .

*Подписные индексы:* 00995 — для индивидуальных подписчиков; 009952 — для организаций.
Свидетельство о регистрации средств массовой информации № 1533 от 30.07.2012, выданное Министерством информации Республики Беларусь.

*В соответствии с приказом Высшей аттестационной комиссии Республики Беларусь от 21 января 2015 г. № 16 научно-практический журнал «Вестник БарГУ» серия «Педагогические науки. Психологические науки. Филологические науки (литературоведение)» включён в Перечень научных изданий Республики Беларусь для опубликования результатов диссертационных исследований по педагогическим и психологическим наукам, филологическим наукам (литературоведению).*

*Научно-практический журнал «Вестник БарГУ» включен в РИНЦ (Российский индекс научного цитирования), лицензионный договор № 06-01/2016.*

Выходит на русском и английском языках.
Распространяется на территории Республики Беларусь.

*Заведующий редакционно-издательской группой* А. Ю. Сидоренко
*Технический редактор* Л. Н. Щербук
*Компьютерная вёрстка* С. М. Глушак
*Корректор* Н. Н. Колодко

Подписано в печать 2022. Формат 60 × 84 1/8.
Бумага ксероксная. Печать цифровая.
Гарнитура Таймс. Усл. печ. л. 11,75. Уч.-изд. л. 8,50.
Тираж 100 экз. Заказ . Цена свободная.

Полиграфическое исполнение: Гродненское областное унитарное полиграфическое предприятие «Слонимская типография». Свидетельство о государственной регистрации издателя, изготовителя, распространителя печатных изданий № 1/203 от 07.03.2014, № 2 от 25.02.2014.
*Адрес: ул. Хлюпина, 16, 231800 г. Слоним, Гродненская обл.*

**РЕДАКЦИОННАЯ КОЛЛЕГИЯ**

**Кочурко В. И.** *(гл. ред. журн.)*, доктор сельскохозяйственных наук, профессор, академик Белорусской инженерной академии, академик Международной академии технического образования, академик Международной академии наук педагогического образования, академик Академии экономических наук Украины, Почётный профессор БарГУ, профессор кафедры технического обеспечения сельскохозяйственного производства и агрономии (учреждение образования «Барановичский государственный университет», Барановичи, Республика Беларусь).

**Климук В. В.** *(зам. гл. ред. журн.)*, кандидат экономических наук, доцент, первый проректор (учреждение образования «Барановичский государственный университет», Барановичи, Республика Беларусь).

**Яценко Т. Е.** *(гл. ред. сер.)*, кандидат психологических наук, доцент (учреждение образования «Барановичский государственный университет», Барановичи, Республика Беларусь); **Захарченя Н. Ф.** *(отв. секретарь сер.)* (учреждение образования «Барановичский государственный университет», Барановичи, Республика Беларусь).

**Бойко А. И.** *(ред. текстов на англ. яз.)* (учреждение образования «Барановичский государственный университет», Барановичи, Республика Беларусь); **Коновалик В. К.** *(ред. текстов на англ. яз.)* (учреждение образования «Барановичский государственный университет», Барановичи, Республика Беларусь).

**Пономарёва Е. И.** *(отв. за направление «Педагогические науки»)*, кандидат педагогических наук, доцент (учреждение образования «Барановичский государственный университет», Барановичи, Республика Беларусь); **Иценко А. Г.** *(отв. за направление «Психологические науки»)*, кандидат философских наук, доцент (учреждение образования «Барановичский государственный университет», Барановичи, Республика Беларусь); **Белая Е. И.** *(отв. за направление «Филологические науки»)*, доктор педагогических наук, доцент (учреждение образования «Барановичский государственный университет», Барановичи, Республика Беларусь).

**Белановская О. В.**, кандидат психологических наук, доцент (государственное учреждение образования «Республиканский институт высшей школы», Минск, Республика Беларусь); **Бельский А. И.**, доктор филологических наук, профессор (Белорусский государственный университет, Минск, Республика Беларусь); **Валитова И. Е.**, кандидат психологических наук, доцент (учреждение образования «Брестский государственный университет имени А. С. Пушкина», Брест, Республика Беларусь); **Брусевич А. А.**, кандидат филологических наук, доцент (учреждение образования «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы», Гродно, Республика Беларусь); **Глазырина Л. Д.**, доктор педагогических наук, профессор (учреждение образования «Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка», Минск, Республика Беларусь); **Джига Н. Д.**, доктор психологических наук, профессор (учреждение образования «Барановичский государственный университет», Барановичи, Республика Беларусь); **Дубешко Н. Г.**, кандидат педагогических наук, доцент (учреждение образования «Барановичский государственный университет», Барановичи, Беларусь); **Капранова В. А.**, доктор педагогических наук, профессор (учреждение образования «Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка», Минск, Республика Беларусь); **Клещёва Е. А.**, кандидат психологических наук, доцент (учреждение образования «Барановичский государственный университет», Барановичи, Республика Беларусь); **Кормнова Н. А.**, кандидат философских наук, доцент (учреждение образования «Барановичский государственный университет», Барановичи, Республика Беларусь); **Кремень М. А.**, доктор психологических наук, профессор (Академия управления при Президенте Республики Беларусь, Минск, Республика Беларусь); **Криштоп И. С.**, кандидат педагогических наук, доцент (учреждение образования «Барановичский государственный университет», Барановичи, Республика Беларусь); **Крусь П. П.**, кандидат философских наук, доцент (учреждение образования «Брестский государственный университет имени А. С. Пушкина», Брест, Республика Беларусь); **Лопатик Т. А.**, доктор педагогических наук, профессор (государственное учреждение образования «Академия последипломного образования», Минск, Республика Беларусь); **Макаревич А. Н.**, доктор филологических

Репозиторий БарГУ

наук, доцент (учреждение образования «Могилёвский государственный университет имени А. А. Кулешова», Могилёв, Республика Беларусь); **Манкевич Ж. Б.,** кандидат психологических наук, доцент (учреждение образования «Барановичский государственный университет», Барановичи, Республика Беларусь); **Олифирович Н. И.,** кандидат психологических наук, доцент (учреждение образования «Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка», Минск, Беларусь); **Пергаменщик Л. А.,** доктор психологических наук, профессор (учреждение образования «Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка», Минск, Республика Беларусь); **Пинюта И. В.,** кандидат педагогических наук, доцент (учреждение образования «Барановичский государственный университет», Барановичи, Республика Беларусь); **Пузыревич Н. Л.,** кандидат психологических наук (учреждение образования «Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка», Минск, Республика Беларусь); **Пучинская Т. М.,** кандидат педагогических наук, доцент (учреждение образования «Барановичский государственный университет», Барановичи, Республика Беларусь); **Тарантей В. П.,** доктор педагогических наук, профессор (учреждение образования «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы», Гродно, Республика Беларусь); **Тарасова Т. Н.,** доктор филологических наук, профессор (учреждение образования «Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка», Минск, Республика Беларусь); **Торхова А. В.,** доктор педагогических наук, профессор (учреждение образования «Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка», Минск, Республика Беларусь); **Храмцова Ф. И.,** доктор политических наук, профессор, кандидат педагогических наук (филиал федерального государственного бюджетного образовательного учреждения высшего образования «Российский государственный социальный университет», Минск, Республика Беларусь).

**МЕЖДУНАРОДНЫЙ РЕДАКЦИОННЫЙ СОВЕТ СЕРИИ**

**Мухтарова Ш. М.,** доктор педагогических наук (Карагандинский государственный университет имени академика Е. А. Букетова, Караганда, Республика Казахстан); **Николаева М. В.,** доктор педагогических наук, доцент, профессор (федеральное государственное бюджетное образовательное учреждение высшего образования «Волгоградский государственный социально-педагогический университет», Волгоград, Российская Федерация); **Селиванов В. В.,** доктор психологических наук, профессор (федеральное государственное бюджетное образовательное учреждение высшего образования «Московский государственный психолого-педагогический университет», Москва, Российская Федерация).

© БарГУ, 2022

Репозиторий БарГУ

Educational institution “Baranovichi State University”

# BarSU Herald

**A quarterly scientific and practical journal**

Published since March 2013
It is published 2 times a year

1 (11), January , 2022.

Series “Education. Psychology. Philology (Literary studies)”

*Promoter:* Educational institution “Baranovichi State University”.

*Editorial address:*
21 Voykova Str., 225404 Baranovichi.
Phone: +375 (163) 45 46 28.
E-mail: vestnik@barsu.by .

*Subscription indices:* 00995 — for individual subscribers; 009952 — for companies.
The certificate of the registration of mass media № 1533 of 30.07.2012 issued by the Ministry of Information of Belarus.

*In accordance with the order of the board of the Higher Attestation Commission of the Republic of Belarus, on January 21, 2015 № 16 the scientific and practical journal “BarSU Herald” the series “Education. Psychology. Philology (Literary studies)” was included in the list of the scientific publications of the Republic of Belarus for publishing the results of dissertation research on pedagogical, psychological and philological sciences (Literary studies).*

*Scientific-and-practical journal “BarSU Herald” is included into RSCI (Russian Science Citation Index), license agreement № 06-01/2016.*

Issued in Russian and English. The journal is distributed on the territory of the Republic of Belarus.

*Managing editor* A. Y. Sidorenko
*Technical editor* L. N. Scherbuk
*Desktop Publishing* S. M. Glushak
*Proofreader* N. N. Kolodko

Signed print 2022. Format 60 × 84 1/8. Paper xerox. Digital printing. Headset Times. Conv. pr. s. l. 11,75.
Acc.-pub. s. l. 8,50. Circulation of 100 copies.
Order .Free price.

Printing performance: Grodno Regional Printing Unitary Enterprise “Slonim printing establishment”. The state registration certificate of the publisher, manufacturer and publications distributor № 1/203 of 07.03.2014, № 2 of 25.02.2014. Address: 16 Hlyupin St., 231800 Slonim, Grodno region.

## EDITORIAL BOARD

**Kochurko V. I.** (*Editor-in-Chief)*, Doctor of Agriculture, Professor, Academician of the Belarusian Academy of Engineering, Academician of the International Academy of Technical Education, Academician of the International Academy of Pedagogical Education, Academician of the Academy of Economic Sciences of Ukraine, Honorary Professor of BarSU, Professor of the Department of Technical Supply of Agricultural Production and Agronomy (educational institution “Baranovichi State University”, Baranovichi, the Republic of Belarus).

**Klimuk V. V.** *(Deputy Editor-in-Chief)*, Ph. D. in Economics, Associate Professor, First Vice-Rector (educational institution “Baranovichi State University”, Baranovichi, the Republic of Belarus).

**Yatsenko T. E.** *(Series Executive Editor)*, Ph. D. in Psychology, Associate Professor (educational institution “Baranovichi State University”, Baranovichi, the Republic of Belarus); **Zhakharchenya N. F.** *(Senior Editor)* (educational institution “Baranovichi State University”, Baranovichi, the Republic of Belarus).

**Boiko A. I.** *(English Text Editor)* (educational institution “Baranovichi State University”, Baranovichi, the Republic of Belarus); **Konovalik V. K.** *(English Text Editor)* (educational institution “Baranovichi State University”, Baranovichi, the Republic of Belarus).

**Ponomaryova E. I.** *(responsible for “Pedagogical Sciences” area)*, Ph. D. in Education, Associate Professor (educational institution “Baranovichi State University”, Baranovichi, the Republic of Belarus); **Itsenko A. G.** *(responsible for “Psychological Sciences” area)*, Ph. D. in Philosophy, Associate Professor (educational institution “Baranovichi State University”, Baranovichi, the Republic of Belarus); **Belaya E. I.** *(responsible for “Philological Sciences” area)*, Doctor of Philology, Associate Professor (educational institution “Baranovichi State University”, Baranovichi, the Republic of Belarus).

**Belanovskaya O. V.,** Ph. D. in Psychology, Associate Professor (educational institution “National Institute for Higher Education”, Minsk, the Republic of Belarus); **Belskiy A. I.,** Doctor of Philology, Professor (Belarusian State University, Minsk, the Republic of Belarus); **Brusevich A. A.,** Ph. D. in Philology, Associate Professor (educational institution “Grodno State University named after Yanka Kupala”, Grodno, the Republic of Belarus); **Valitova I. Y.,** Ph. D. in Psychology, Associate Professor (educational institution “Brest State University named after A. S. Pushkin”, Brest, the Republic of Belarus); **Glazyrina L. D.,** Doctor of Education, Professor (educational institution “Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank”, Minsk, the Republic of Belarus); **Dzhiga N. D.,** Doctor of Psychology, Professor (educational institution “Baranovichi State University”, Baranovichi, the Republic of Belarus); **Dubeshka N. G.,** Ph. D. in Education, Associate Professor (Educational institution “Baranovichi State University”, Baranovichi, the Republic of Belarus); **Kapranova V. A.,** Doctor of Education, Professor (educational institution “Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank”, Minsk, the Republic of Belarus); **Kleshcheva E. A.,** Ph. D. in Psychology, Associate Professor (educational institution “Baranovichi State University”, Baranovichi, the Republic of Belarus); **Kormnova N. A.,** Ph. D. in Philosophy, Associate Professor (educational institution “Baranovichi State University”, Baranovichi, the Republic of Belarus); **Kremen M. A.,** Doctor of Psychology, Professor (Academy of Public Administration under the Aegis of the President of the Republic of Belarus, Minsk, the Republic of Belarus); **Krishtop I. S.,** Ph. D. in Education, Associate Professor (educational institution “Baranovichi State University”, Baranovichi, the Republic of Belarus); **Krus P. P.,** Ph. D. in Philosophy, Associate Professor (educational institution “Brest State University named after A. S. Pushkin”, Brest, the Republic of Belarus); **Lopatik T. A.,** Doctor of Education, Professor (educational institution “Academy of Postgraduate Education”, Minsk, the Republic of Belarus); **Makarevich A. N.,** Doctor of Philology, Associate Professor (educational institution “Mogilev State University named after A. A. Kuleshov”, Mogilev, the Republic of Belarus); **Mankevich Z. B.,** Ph. D. in Psychology, Associate Professor (educational institution

Репозиторий БарГУ

“Baranovichi State University”, Baranovichi, the Republic of Belarus); **Olifirovich N. I.,** Ph. D. in Psychology, Associate Professor (educational institution “Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank”, Minsk, the Republic of Belarus); **Pergamenshchik L. A.,** Doctor of Psychology, Professor (educational institution “Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank”, Minsk, the Republic of Belarus); **Pinyuta I. V.,** Ph. D. in Education, Associate Professor (educational institution “Baranovichi State University”, Baranovichi, the Republic of Belarus); **Puzyrevich N. L.,** Ph. D. in Psychology, Associate Professor (educational institution “Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank”, Minsk, the Republic of Belarus); **Puchinskaya T. M.,** Ph. D. in Education, Associate Professor (educational institution “Baranovichi State University”, Baranovichi, the Republic of Belarus); **Tarantey V. P.,** Doctor of Education, Professor (educational institution “Grodno State University named after Y. Kupala”, Grodno, the Republic of Belarus); **Tarasova T. N.,** Doctor of Philology, Professor (educational institution “Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank”, Minsk, the Republic of Belarus); **Torhova A. V.,** Doctor of Education, Professor (educational institution “Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank”, Minsk, the Republic of Belarus); **Hramtsova F. I.,** Doctor of Political Sciences, Professor, Ph. D. in Education (educational institution of higher professional education “Russian State Social University”, Minsk, the Republic of Belarus).

**INTERNATIONAL EDITORIAL BOARD OF THE SERIES**

**Muhtarova S. M.,** Doctor of Education (Karaganda State University named after the academician E. A. Buketov, Karaganda, the Republic of Kazakhstan); **Nikolaeva M. V.,** Doctor of Education, Professor (federal budget educational institution of higher professional education “Volgograd State Socio-pedagogical University”, Volgograd, the Russian Federation); **Selivanov V. V.,** Doctor of Psychology, Professor (federal budget educational institution of higher professional education “Moscow State Psycho-pedagogical University”, Moscow, the Russian Federation).

© BarSU, 2022

Репозиторий БарГУ

## СОДЕРЖАНИЕ

### ПЕДАГОГИЧЕСКИЕ НАУКИ

**Дегиль Н. И., Старостин С. А.** Модель формирования толерантного отношения студенческой молодежи к беженцам **6**

**Кривуть М. Л.** Роль дисциплины «Коммуникативная деятельность педагога инклюзивного образования» в формировании стилей межличностного поведения у студентов **14**

**Романов В. А., Глузман Н. А.** Учебная деятельность студентов в условиях онлайн-обучения в период пандемии COVID-19: стилевые особенности **22**

**Рудая Д. В.** Педагогическая целесообразность внедрения факультативного курса «К олимпийским вершинам» по предмету «Физическая культура и здоровье» в образовательный процесс младших школьников 6—7 лет **29**

**Унсович А. Н., Яценко Т. Е.** Региональные аспекты непрерывной подготовки педагогических кадров **36**

### ПСИХОЛОГИЧЕСКИЕ НАУКИ

**Джига Н. Д.** Образ-результат будущего педагога-психолога, являющегося созидателем, в представлениях обучающихся по специальности «Практическая психология» **43**

**Иценко А. Г.** Психология религии в религиозно-философском наследии профессора П. Я. Светлова **50**

**Клещёва Е. А.** Психологическая диагностика семейной иерархии: авторская проективная методика **57**

**Комкова Е. И.** Особенности самосознания старших дошкольников с разным уровнем когнитивного развития **62**

**Король М. А.** Характеристики толерантности к неопределенности у студентов позднего юношеского возраста из городской и сельской местности **68**

**Курило М. В.** Взаимосвязь виртуальной и межличностной виктимности в сети Интернет у учащихся юношеского возраста **74**

### ФИЛОЛОГИЧЕСКИЕ НАУКИ
**Литературоведение**

**Брусевіч А. А.** Асаблівасці фарміравання матыўна-вобразнага поля паэзіі Вінцэнта Каратынскага **80**

**Садко Л. М.** Полісістэмнасць у літаратурна-крытычных артыкулах і ранняй лірыцы З. Бядулі **86**

## CONTENTS

### EDUCATION

**Dzehil N. I., Starastsin S. A.** Model of formation of tolerant attitude of student youth to refugees

**Krivut M. L.** The role of the discipline “Communicative activity of a teacher of inclusive education” in formation of students’ styles of interpersonal behavior

**Romanov V. A., Gluzman N. A.** Learning activity of students in online learning during the COVID-19 pandemic: style features

**Rudaya D. V.** Pedagogical feasibility of introducing the optional course “To the olympic heights” on the subject “Physical training and health” in the educational process of junior schoolchildren aged 6—7

**Unsovich A. N., Yatsenko T. E.** Regional aspects of continuous training of teaching staff

### PSYCHOLOGY

**Juha N. D.** The image-result of a future teacher-psychologist, who is a creator, in the representations of students in the specialty “Practical psychology”

**Itsenko A. G.** Psychology of religion in the religious and philosophical heritage of professor P. Ya. Svetlov

**Klescheva E. A.** Psychological diagnostics of the family hierarchy: the author’s projective technique

**Komkova E. I.** Features of self-awareness of older preschoolers with different levels of cognitive development

**Korol M. A.** Characteristics of tolerance to uncertainty in late youth students from urban and rural areas

**Kurilo M. V.** The relationship between virtual and interpersonal victimisation on the Internet in adolescent students

### PHILOLOGY
**Literary studies**

**Brusevich A. A.** Features of the formation of a motive-figurative field of Vincent Korotynsky’s poetry

**Sadko L. M.** Polysystematic approach in literary-critical articles and early lyrics of Z. Byadulya

Репозиторий БарГУ

УДК 82-95:821.161.3-14

**Л. М. Садко,** кандыдат філалагічных навук, дацэнт
Дзяржаўная навуковая ўстанова «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», вул. Сурганава, 1, корп. 2, 220072 Мінск, Рэспубліка Беларусь,
+375 (29) 790 09 30, konovod1@yandex.ru

# ПОЛІСІСТЭМНАСЦЬ У ЛІТАРАТУРНА-КРЫТЫЧНЫХ АРТЫКУЛАХ І РАННЯЙ ЛІРЫЦЫ З. БЯДУЛІ

Артыкул прысвечаны пытанням мастацкай прыроды ранніх твораў беларускага паэта, празаіка і публіцыста З. Бядулі — літаратурна-крытычных артыкулаў «Не адным хлебам…», «Кузня беларускага мастацтва. Думкі аб студыі Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра ў Маскве», а таксама аналізу вершаў паэта 1909—1914 гадоў з пазіцый полісістэмнай тэорыі. Выяўлена, што артыкулы З. Бядулі маюць вялікі філасофска-эстэтычны патэнцыял, утрымліваюць распрацоўку культуралагічнай і літаратуразнаўчай праблематыкі, што вызначыла шляхі развіцця беларускага прыгожага пісьменства і апярэдзіла з'яўленне многіх сучасных падыходаў у галіне гуманітарыстыкі. Адзначаецца, што ў шматграннай ранняй лірыцы паэта знайшлі ўвасабленне як рысы рэалістычнай эстэтыкі і паэтыкі, так і рысы мадэрнісцкіх плыняў і накірункаў: пазітывізму, натуралізму, экспрэсіянізму, імпрэсіянізму.

**Ключавыя словы:** полісістэмнасць; З. Бядуля; пазітывізм; натуралізм; экспрэсіянізм; імпрэсіянізм.
Бібліягр.: 13 назваў.

**L. M. Sadko,** Candidate of Philology, assistant professor
Research Centre of Belarusian Culture, Language and Literature of the National Academy of Sciences Belarus,
1 Surganova Str., bldg. 2, 220072 Minsk, the Republic of Belarus, +375 (29) 790 09 30, konovod1@yandex.ru

# POLYSYSTEMATIC APPROACH IN LITERARY-CRITICAL ARTICLES AND EARLY LYRICS OF Z. BYADULYA

The article is devoted to the artistic nature matter of the early works of the Belarusian poet, novelist and publicist Z. Byadulya — his literary-critical articles "Not only on bread…", "The forge of the Belarusian art. Thoughts on the Studio of the Belarusian State Academic Theater in Moscow". The article also provides the analysis of the poet's 1909—1914 poems from the standpoint of polysystematic approach. The author states that Z. Byadulya's articles have a great philosophical and aesthetic potential, contain the development of cultural and literary issues, which determined the development of Belarusian literature and preceded the emergence of many modern approaches in the humanities. It is noted that in his multifaceted early lyrics the poet embodied both, features of realistic aesthetics and poetics, as well as the features of modernist trends: positivism, naturalism, expressionism, impressionism.

**Key words:** polysystematic approach; Z. Byadulya; positivism; naturalism; expressionism; impressionism.
Ref.: 13 titles.

Репозиторий БарГУ

**Уводзіны.** У полісістэме беларускай літаратуры канца XIX — пачатку XX стагоддзя назіраецца сітуацыя, калі розныя па прынцыпах адлюстравання чалавека і сусвету мастацкія накірункі і плыні, стылёвыя праявы розных эпох плённа суіснуюць побач, па чарзе займаючы то дамінуючае, то перыферыйнае становішча як увогуле, так і ў творчасці пэўных аўтараў. Тэарэтык і арганізатар руху беларускага адраджэння А. Луцкевіч адзначаў, што «ў сям'і "нашаніўцаў" дужа добра ўжываліся побач прадстаўнікі народніцкага натуралізму і рамантызму, рацыяналізму і містыцызму, пралетарскай барацьбы і эстэтызму, канчаючы разнароднымі плынямі нэарамантызму» [1, с. 255]. Літаратуразнаўца У. Казбярук, пагаджаючыся, працягвае:

© Садко Л. М., 2022

«Аблічча беларускай літаратуры вызначыў сінтэз рэалізму і рамантызму з перавагай у паасобныя моманты то аднаго, то другога напрамку» [2, с. 181]. Каб даць характарыстыку складаных і неадназначных узаемаадносінаў у сферы эстэтыка-літаратурнага жыцця Беларусі на рубяжы XIX—XX стагоддзяў, У. Калеснік таксама звяртаўся да паняццяў «сінтэз», «паяднанне»: «У 20-я гады (XX ст. — Л. С.) беларуская літаратура марыла пра арганічны сінтэз эмацыянальнай рамантычнасці з класічнай дасканаласцю формы, пра паяднанне рэвалюцыйнага касмізму з рэальнасцю сацыялістычнага будаўніцтва, фантазіі з явай, пачуцця з думкай» [3, с. 306]. Сучасны гісторык Н. Якуш, аналізуючы культуралагічныя і літаратурныя з’явы ў дадзены перыяд, адзначае, што «ў пачатку XX стагоддзя назіралася і сінкрэтычнае, і эклектычнае спалучэнне фальклорных вытокаў, беларускіх культурных архетыпаў, традыцыйных выразных мастацкіх форм з новымі стылявымі накірункамі, выяўленчымі прыёмамі, метадамі. Такое спалучэнне традыцыі і эстэтыкі мадэрнізму ў розпай ступені закранула ўсе сферы беларускага мастацтва, вылівалася ў дыскусійнасць, эксперыментатарства, духоўную актыўнасць» [4, с. 120].

У другой палове XX стагоддзя гуманітарыстам І. Эвен-Зохарам на аснове падыходаў Ю. Тынянава, В. Шклоўскага, Б. Эйхенбаума, а таксама сістэмна-сінергетычных прынцыпаў была распрацавана перспектыўная тэорыя полісістэмы, згодна з якой «полісістэма, г. зн. “сістэма сістэм” разглядаецца як шматслойная цэласнасць, дзе адносіны паміж цэнтрам і перыферыяй уяўляюць сабой шэраг апазіцый. Гэта фактычна дазваляе вылучыць гіпотэзу пра існаванне больш чым аднаго “цэнтра”, хоць у многіх гістарычных прыкладах цэнтры стратыфікаваны такім чынам, што ў канчатковым выніку адзін з іх дамінуе над усёй сукупнасцю» [5, с. 88]. Функцыянаванне любой сацыясеміятычнай з’явы, у тым ліку і літаратуры, даводзяць полісістэмісты, характарызуецца парадыгмальнай множнасцю суіснавання ў яе асяродку практык пануючага тыпу і альтэрнатыўнага зместу, якія імкнуцца заняць цэнтральнае становішча, адпавядаць розным экстра- і інтралітаратурным запытам. Адсюль больш мэтазгодным для характарыстыкі такога становішча з’яўляецца выкарыстанне паняцця полісістэмы, у тым ліку і для вызначэння поліпарадыгмальнага характару ранняй лірыкі класіка беларускай літаратуры З. Бядулі.

**Матэрыялы і метады даследавання.** Аб’ектам вывучэння выступаюць літаратурна-крытычныя артыкулы і ранняя лірыка З. Бядулі. Метадалагічная аснова даследавання — працы І. Эвен-Зохара, А. Луцкевіча, У. Казбярука, У. Калесніка, З. Мельнікавай. Даследаванне грунтуецца на культурна-гістарычных прынцыпах, метадах полісістэмістыкі і кампаратывістыкі.

**Вынікі даследавання і іх абмеркаванне.** У сваіх літаратурна-культуралагічных досведах З. Бядуля прапануе сістэмны падыход да разумення рэчаіснасці, найперш мастацтва. У артыкуле «Не адным хлебам…» (1913) класік выразна дэкларуе полісістэмны характар сваёй творча-эстэтычнай канцэпцыі: «Хараство — гэта гарманічна скрысталізаваныя жыццёвыя атамы, каторыя, губляючы сваю даўнейшую хаатычнасць, уваходзяць у цыкл кемнасці, штукарства. У розных вопратках з’яўляецца яно: у музыцы, у паэзіі, у малярстве, у разьбярстве, у будаўніцтве, у рамёслах, у звычаях рэлігійных і свецкіх. Жыццё можна назваць кветкай, хараство — мёдам гэтай кветкі, а чалавека — пчалінай, збіраючай гэты мёд. Паўтараю: хараство або штукарства (артызм) — гэта сама прырода ў кароне сваёй вялікай творчасці» [6, с. 384—385]. Літаратуразнаўца З. Мельнікава якраз адзначае, што З. Бядуля стварае поліцэнтрычную мадэль сусветнай культуры, дзе адносіны цэнтра і перыферыі, розных нацыянальных мастацкіх традыцый не прадугледжваюць скасавання ці элімінацыі аднаго з кампанентаў: «Заахвочваючы і пераконваючы, што ўсё, у чым праяўляецца душа народа, неабходна збіраць, запісваць, фатаграфаваць, Змітрок Бядуля падкрэсліваў, што гэта і ёсць наша хараство і багацце, але ж адначасова яно з’яўляецца часцінкай агульналюдскага хараства і багацця» [7, с. 7]. Важным чыннікам развіцця нацыянальнай культуры і самасвядомасці З. Бядуля лічыць працэсы інтэрфе-

Рэпазіторый БарДУ

рэнцыі, сінтэзу, барацьбы розных рэпертуараў (традыцыйных і наватарскіх, індывідуальных і агульных, элітарных і масавых, сусветных і рэгіянальных) за дамінуючае становішча ў межах нацыянальнай сацыясеміятычнай сістэмы: «кожнаму народу трэба стаяць за сваё, толькі за сваё… І гэтым самым прыносіць ён карысці ўсім, паказваючы свае самабытныя творчасці, а не копіі — здымкі з чужога… Усе людзі на зямлі, ва ўсёй здабыванай культуры сваёй, стараліся кожны толькі сваё выказаць…» [6, с. 394].

Больш позні артыкул (ужо «паслякастрычніцкага» перыяду) «Кузня беларускага мастацтва. Думкі аб студыі Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра ў Маскве» З. Бядулі можна лічыць праграмным дакументам, які дэкларуе асноўныя праблемы новай беларускай культуры. У гэтым тэарэтыка-эстэтычным артыкуле вызначаюцца прыярытэтныя складнікі, якія ў вялікай ступені ўплываюць на развіццё камунікацыі, а значыць, забяспечваюць жыццяздольнасць і развіццё нацыянальнай мастацкай полісістэмы. Артыкул дэманструе рысы новага мастацка-філасофскага мыслення, арыгінальныя думкі пра шляхі беларускага адраджэння. Пазней, у другой палове XX стагоддзя, Р. Якабсонам, І. Эвен-Зохарам былі прапанаваны мадэлі камунікацыі, вызначаны яе функцыянальныя кампаненты, што мае дачыненне не толькі да мастацкага тэксту як найважнейшага элемента літаратурнага працэсу, а і да тэатра, а таксама цэлага шэрагу інтра- і экстралітаратурных з'яў гетэрагеннага і дынамічнага характару. З. Бядуля слушна вызначае праблемы беларускай літаратуры і тэатра пачатку XX стагоддзя — адсутнасць найважнейшых кампанентаў: адрасанта, адрасата, а таксама распрацаванага сучаснага рэпертуару, сацыяльных інстытуцый і рынка, што функцыянуюць на беларускай мове і адпавядаюць нацыянальным эстэтыка-паэтычным мадэлям. У артыкуле ўдакладняюцца спосабы і прыёмы распрацоўкі рэпертуару новага беларускага мастацтва. З. Бядуля дэкларуе дзесяць патрабаванняў, якія неабходна ўлічыць для паспяховага развіцця нацыянальнага тэатра як шматграннай сілы, «што ахоплівае ўсе формы мастацкай творчасці» [6, с. 404]. Крытык звязвае поспехі будучага беларускага тэатра з яго «*выключнай беларускасцю*» (вылучана З. Бядулем. — Л. С.) [6, с. 406]. З. Бядуля даводзіць, што для будучых тэатралаў беларусазнаўства ў яго полісістэмным выглядзе як комплекс ведаў па гісторыі, літаратуры, этнаграфіі павінна быць пашырана да максімуму. Дбае аўтар артыкула і пра стварэнне пры тэатральных студыях своеасаблівых сінтэзаваных максімальна поўных фондаў, сховішчаў не толькі літаратурных твораў, але і народнай музыкі, танцаў, нацыянальных музычных інструментаў, вопраткі, бытавых рэчаў. Што тычыцца ўласна тэатральнага рэпертуару, то З. Бядуля справядліва адзначае: «Нам спачатку дайце з беларускіх падмосткаў беларускае. Ужо пасля, калі беларускі тэатр нажыве сабе імя сваёй уласнай творчасцю, тады толькі можна будзе даць і сусветных класікаў» [6, с. 408]. Падобнае сінтэзаванне ўсіх магчымых мастацкіх родаў і відаў, сродкаў эстэтыкі і паэтыкі ў бядулеўскім артыкуле — адзіны магчымы шлях да стварэння нацыянальнай культуры, «эпохі ў беларускім мастацтве» [6, с. 408].

Вядомыя беларускія літаратуразнаўцы Л. Баршчэўскі, П. Васючэнка, М. Тычына вылучаюць, акрамя зніташанасці мастацкіх сістэм розных плыняў і накірункаў у творчасці З. Бядулі, яшчэ адну характэрную праяву полісістэмнасці эстэтыкі і паэтыкі яго твораў. Даследчыкі адзначаюць, што аўтар «выявіў такую асаблівасць нацыянальнага жыцця, як працяглае гістарычнае існаванне поруч двух этнасаў: карэннага, беларускага і габрэйскага, абмежаванага так званай *мяжой аселасці*. Гэтая асаблівасць выявілася і ў змесце, і ў форме яго твораў, якія культурна ўзбагацілі жанрава-стылявую плынь нашай літаратуры, арыентуючы яе на ўзнёслую ўрачыстасць Талмуда і Бібліі» [8, с. 333—334]. Сапраўды, мастацкая манера З. Бядулі вылучаецца асаблівым светабачаннем, кандэнсаванай метафарычнасцю, выкарыстаннем прэцэдэнтных імёнаў, звязаных з яўрэйскай культурай і старазапаветнымі вобразамі.

Адзначым, што творчая спадчына З. Бядулі шматслойная, яна аб'ядноўвае ў сабе розныя тэндэнцыі часу, розныя прынцыпы адлюстравання рэчаіснасці — ад рэалістычных да лірыка-філасофскіх і мадэрновых. З. Мельнікава вызначае шэраг матываў і эстэтыка-паэтычных ідэалаў,

Рэпазіторый БарДУ

характэрных для твораў класіка: «У Бядулевай творча-эстэтычнай канцэпцыі гарманічна спалучаліся грамадзянска-патрыятычныя, сацыяльна-класавыя матывы з эстэтыкай прыгажосці і ідэаламі харавства» [7, с. 11]. Сам З. Бядуля разумее памежнае існаванне беларускага мастацтва, яго поліцэнтрычны характар: «Наша літаратура яшчэ знаходзіцца на рубяжы. Мінулае з сучасным пераблытаны ў адно па сягонняшні дзень» [6, с. 411]. Адзначае «мешаніну формаў і вобразаў — ад народных прымітываў да мастацка-сучаснай віртуознасці» [6, с. 410]. Працягваючы тэму «мешаніны», З. Бядуля напаўняе гэтае паняцце філасофскім гучаннем, узбуйняе яго да светапогляднага статусу: «Гэтая ж мешаніна адбівае псіхіку і настроі сучаснасці. Раздвоенасць аказалася не толькі ў мастацтве, але і ў быту, у жыцці» [6, с. 411—412]. Вядома, што тэма дыялектыкі душы, яе дваістай прыроды таксама распрацоўвалася ў тэарэтычным і мастацкім аспектах М. Гарэцкім («Развагі і думкі», «Дзве душы»).

На мяжы XIX—XX стагоддзяў у беларускім літаратурна-мастацкім працэсе праяўляе сябе сістэма тэндэнцый, заснаваная на індуктыўнай логіцы пазітывізму, калі літаратары-народнікі звяртаюцца да вопытных, эмпірычных дадзеных, ствараюць замалёўкі з натуры, карыстаючыся амаль тымі ж метадамі, што і прыродазнаўцы, пазбягаючы дэфармацыі фактаў і іх ацэнкі. Такая літаратура, па словах І. Багдановіч, «паказвала беларусу яго самога ў гістарычнай перспектыве і рэтраспектыве» [9, с. 7], дакладна адлюстроўвала чалавека-працаўніка, селяніна з усім комплексам цяжкасцей яго існавання, тлумачыла, «чаму плача песня наша» (Я. Купала). Як тлумачаць тэарэтыкі семіётыкі, існуе шэраг культур, арыентаваных на «пазіцыю слухаючага» (адрасата), у такім выпадку «аксіялагічная іерархія тэкстаў размяшчаецца так, што паняцці “найбольш каштоўны” і “самы зразумелы” супадаюць», а «пэўнае» «сапраўднае» «простае» будуць разглядацца як вышэйшыя аксіялагічныя характарыстыкі» [10, с. 510]. Народніцка-натуралістычныя творы Я. Лучыны, А. Гурыновіча, К. Каганца, Ядвігіна Ш., Цёткі, З. Бядулі, Я. Коласа, заснаваныя на рэпертурэмах, зразумелых менавіта простанароднаму чытачу, малявалі змрочныя сцэны цяжкага лёсу працаўніка, часам шырока ўжываючы сродкі каталагізацыі і гіпербалізацыі для апісання жыцця селяніна.

У вершы З. Бядулі «Ці хто забывае цябе, небарака?..» (1910) перададзена атмасфера антыгуманных адносінаў да чалавека працы, так распаўсюджаных у грамадстве. Верш заснаваны на пазітывісцкім разуменні дакладнасці, факты прыводзяцца з фатаграфічнай дэталёвасцю, не падзяляюцца на прывабныя або непрывабныя. Але замест характэрнай эстэтычна нейтральнай пазіцыі аўтара, прынцыповага дэтэрмінізму і статычнасці ў выяўленні абставін жыцця прапаноўваецца вельмі выразная дэкларацыя прыгнёту як ненатуральнай з’явы, сацыяльнай хваробы. Жабрацкія абставіны жыцця беларускага селяніна, непасільная праца — усё гэта паказана аўтарам з бязлітаснай праўдзівасцю і гуманізмам, што актуалізуе эстэтычныя і паэтычныя сродкі па-за межамі пазітывісцка-натуралістычнага пісьма:

Мацнейшы стаптаў у шаленстве ў дзікім
Дачок тваіх гонар у гразь па зямлі.
Ад вечнай бяды, ад нядолі вялікай
Аж вочы туманам, крывёй заплылі.

А праца твая — на раскошы зладзеям,
А сам ты на свеце — няпрошаны госць,
Табе, як сабаку, даюцца памыі,
З агідай кідаюць галоднаму косць [11, с. 23].

Гэтая дэталёвасць, згушчанасць атмасферы гаротнасці ў «ранненашаніўскіх» творах З. Бядулі, выразныя межы паміж дабром і злом, мастацкая канцэпцыя ідэалізацыі бедака-селяніна, уражлівасць і эмацыянальнасць у адлюстраванні яго існавання даюць падставы ґаварыць і пра элементы сентыменталісцкай эстэтыкі ў літаратуры названага перыяду. У вершы

Рэпазіторый БарГУ

«Пастушка» (1911) З. Бядулі пранізліва ўвасоблена тэма бязвіннай пакуты дзіцяці, што ні разу не ела ўдосталь, не ведала цяпла і бестурботнага жыцця, з маленства працуючы без усялякай надзеі на лепшае. Атмасфера ў гэтым вершы вельмі далёкая ад ідылічных пастараляў на ўлонні прыроды:

Хоць раз ці была я ў матулі пястушкай,
Хоць раз ці карміла матуля як след.
Служу я ў фальварку, тут блізка, пастушкай.
Служу нізавошта ўжо некалькі лет [11, с. 32].

Гераіня апавядае пра сваё будзённае жыццё, пра слёзы, маркоту, заўсёдныя голад і холад, узгадваючы дэталі, што ўражваюць да глыбіні душы. Знешні свет прыроды ў гэтым вершы («вільгаць», «гразь», «магільнік», «хмызняк», «багна») зліваецца, як характэрна для літаратуры сентыменталізму, з унутраным станам чалавечай душы:

На раніцу статак пускаю на выган,
Адтуль па балоце — на панскі барок.
На могілках страхам нязведаным вее,
Апрыкрала грэбля, крыжы і пясок [11, с. 32].

Паэт узнімае пытанне пра магчымасці і шляхі дасягнення простым чалавекам шчасця, даводзіць уласцівыя сентыменталісцкім творам дыдактычныя думкі. Але ў вершы няма нічога ад сялянскай ідыліі, маральнага задавальнення ад сузірання прыроды, культу «натуральнага чалавека», што існуе ў суладдзі з наваколлем. Наадварот, апошні катрэн гучыць пафасам выкрыцця сацыяльных праблем, якія не прынята было дэклараваць у творах сентыменталізму:

А думкі наводзяць на злосць і на смутак,
Хоць птушкі пяюць ад зары да зары.
Ніхто не раскажа — не знаю, чаму так...
Такое жыццё — хоць агнём ты згары!.. [11, с. 33].

У больш позніх творах З. Бядулі гэтая абвостраная суб'ектыўнасць інтэрпрэтацыі, уважлівасць да душы чалавека, які б'ецца ў няволі нядобра ўладкаванага жыцця, прыводзіць да выкарыстання рыс эстэтыкі і паэтыкі экспрэсіянізму. Як адзначаюць даследчыкі, «мастацкія малюнкі Бядулі прыкметна стылізаваныя, павышана экспрэсіўныя, прасякнутыя сімвалізмам» [8, с. 336].

Апакаліптычныя сюжэты знаходзілі сваё месца ў беларускай літаратуры і раней — у творах К. Каліноўскага, Ф. Багушэвіча, Я. Лучыны, якія ўсведамлялі праблему сэнсу чалавечага жыцця скрозь прызму «сялянскага пытання», такога вострага ў беларускім сацыякультурным асяроддзі. Катастрафічна-трагічнае светаўспрыманне атрымлівае новы імпульс у сувязі з феноменам складанага станаўлення нацыянальнай самасвядомасці, а таксама з рэвалюцыйнымі і ваеннымі падзеямі. Як адзначае А. Луцкевіч, чуйна выяўляючы наватарскія падыходы да адлюстравання чалавека і сусвету ў творах беларускага класіка, «на вельмі уражлівай, чулай душы Зьмітрака Бядулі вельмі востра адбілася ўзьняўшаяся неўспадзеўкі вайна. Яна закранула нейкія новыя — бурлівыя — струны ў яго душы. У яго вершах бачым небывалы размах, нязнаную раней сілу» [1, с. 74]. І сапраўды, у вершах, датаваных 1914 годам («Вайна», «Мяцежнік», «Ад крыві чырвонай», «Не мы…», «І будзе на палях трывожная работа…», «Арліхі»), з'яўляюцца абвострана-эмацыянальныя вобразы, максімальна абстрагаваныя, касмічна маштабныя. Стылістыка знакамітай анталогіі нямецкамоўных экспрэсіяністаў «Змярканне чалавецтва» ("Menschheitsdmmerung"), што выйшла ў 1919 годзе, выразна пераклікаецца з названымі творамі З. Бядулі, які пераходзіць ад лакальна-нацыянальнага тэматычнага поля да ўсеагульных, універсальных локусаў, у гратэскава-фантастычных



Рэпазіторый БарГУ

вобразах апісвае дысгарманічнае існаванне чалавека пасярод апакаліпсісу жыцця, гвалту вайны. У вершы «Мяцежнік» (1914), інтанацыйна ўзрушаным, насычаным пранізлівымі ўскрыкамі, з’яўляюцца абагульненыя вобразы смерці, віхурных хваль, адчаю. У традыцыях экспрэсіянізму амплітуда пачуццяў у вершы надзвычай шырокая — ад лямангу адчаю і змрочных прароцтваў да нястрымна-захопленага сцвярджэння:

Пад небам імчацца чырвоныя коні,
Пярун з навальніцай
Рагочуць на гонях.
І страх,
І дрыготы
Абшар абвілі,
Віхорыцца ўсё на зямлі...
І кроў...
І руіны...

Ой, горкая будзе, дзяцюк, твая доля! —
Смерць зрэжа касою,
Бы кветку-расліну,
Груган знясе косці па полі...
Хай граюць,
Буяюць
Віхровыя хвалі!
Хай плачуць,
Хай скачуць —
Ім вольніцу далі [11, с. 83].

Навакольны свет у такіх вершах паказаны праз прызму ўспрымання суб’екта, адлюстроўвае атмасферу закінутасці, страчанасці чалавека ў свеце, безабароннасці яго перад сіламі лёсу. Трагічныя малюнкі быцця чалавека пасярод вайны — гратэскавыя сімвалы крайніх станаў спустошанага і богапакінутага жыцця наогул, пагібельна-катастрафічнага светаадчування. Кожны з мастакоў-экспрэсіяністаў даваў свой адказ на пытанне пра дысгарманічныяў заемадачыненні чалавека і чужога злога свету, але найбольш пашырана ўвага да чалавечага жыцця на парозе блізкай і непазбежнай смерці. У вершы «Ад крыві чырвонай» кантрасна і эмацыянальна насычана перададзены стан чалавека, ахопленага жахам вайны, даведзенага да кульмінацыі адчаю:

Ад крыві чырвонай фарбаваўся Нёман.
Гаціліся гаці з трупаў па вадзе.
Дзікі свіст і бразгат. І выццё і гоман.
Бітва, як ніколі... бітва, як нідзе...
Людзі, коні разам гойдаліся ў сечы,
Малаціў галовы алавяны град...
Вочы непрытомны. Крык нечалавечы.
Смерць прымала строга жудасны парад [11, с. 85].

Па-майстэрску выкарыстоўвае З. Бядуля прыём кантрасту, адзін з базавых у экспрэсіянізме. Паэт не толькі выяўляе супярэчнасці, але і паказвае філасофскую знітаванасць процілегласцей. Закон татальнай няправеднасці існавання наогул і мілітарысцкага ў прыватнасці ў кантрасных вобразах увасоблены ў вершы «І будзе на палях трывожная работа…» (1914). Традыцыйная для беларускай літаратуры і культуры сімволіка, звязаная з жыццядайнай земляробчай працай, набывае ў гэтым творы супрацьлеглую канатацыю, пераўтвараецца ў танатычную:

Давай зямлю араць гранатамі тым часам,
А тысячамі куль пасля баранаваць,
Гнаіць крывёй людской і дымным цёплым мясам,
Штыкамі растрасаць.

І пойдзе так сяўба — жалеза і патроны,
І буйны колас-смерць пад сонцам зашуміць.
Пагібель будуць жаць — і пошасці, і стогны,
Пакуту малаціць [11, с. 87].

Репозиторий БарГУ

Свет у гэтым вершы малюецца як царства гвалтоўных сіл, як прадчуванне сусветных катастроф, што выводзіць яго на ўзровень пазагістарычных абагульненняў. Па абстрактнасці і пачварнасці вобразаў твор набліжаецца да эстэтыкі сюррэалізму.

Творчая палітра З. Бядулі ў ранняй лірыцы была багатая і на праявы рыс імпрэсіянізму. У вершах-імпрэсіях, якія могуць быць аб’яднаны пад назвай «Настроі» (1909—1913), выяўлены розныя станы прыроды, поры года і часы дня і ночы, што глыбока звязаны з перажываннямі лірычнага героя, яго псіхічным станам. В. Жураўлёў у гэтай сувязі гаворыць пра «ўзвышаную, рамантычную і ўзнёсла-паэтычную танальнасць, якая ў чымсьці нагадвае велічны гімн велічным, гарманічным, прыгожым і ўпарадкаваным з’явам жыцця» [12, с. 143]. Сапраўды, З. Бядуля ў падобных вершах апявае харawство рэчаіснасці, знаходзіць натхненне ў пейзажах, гульні святла, пахаў і гукаў, з тонкім псіхалагізмам перадае эмацыянальныя зрухі ў душы героя. Прырода ў З. Бядулі набывае здольнасць адчуваць, актыўна ўзаемадзейнічаць з чалавекам. Даследчык беларускага імпрэсіянізму Т. Мацюхіна адзначае, што «незвычайнасць бядулеўскіх пейзажаў — у іх прытчавым характары, афарыстычнасці і дыдактызме» [13, с. 105]. У вершы «Зімовая раніца» (1910) гэтыя рысы праяўляюць сябе ў поўнай ступені:

Зычна званіла, крынічыла
Блізка крынічка за горкай;
Не змаразіў злы мароз,
Хоць невялічкая,
Нібы то вока —
Рогат да слёз...

Эх, каб і сэрцы каб нашыя
Так не баяліся гора,
Грозных жыцця непагод,—
Шмат назапасілі б
Сіл у прасторы
З году ды ў год!.. [11, с. 53].

**Заключэнне.** У артыкулах З. Бядулі 1910-х гадоў праяўляе сябе полісістэмісцкая пазіцыя, згодна з якой мастацкія з’явы разглядаюцца ва ўзаемасувязі цэлага шэрагу інтра- і экстраэстэтычных фактаў гетэрагеннага і дынамічнага характару. Полісістэмны характар мастацкай манеры З. Бядулі на скрыжаванні пазітывісцкага, рэалістычнага, сентыменталісцкага, экспрэсіянісцкага, імпрэсіянісцкага напрамкаў дае магчымасць шматаспектнага адлюстравання знешніх праяў жыцця і яго глыбінных унутраных заканамернасцей, забяспечвае магчымасць узаемадзеяння і ўзаемаабагачэння напрамкаў. Патэтыка, грамадска-крытычная ўзрушанасць, інтанацыя пратэсту супраць зацкаванасці чалавечай асобы ваеннай машынай і сацыяльным прыгнётам гучаць у вершах З. Бядулі 1914 года. Такія прыёмы дазваляюць паэту надзвычай эмацыянальна расказаць пра вострыя, асноватворныя праблемы існавання чалавека наогул, беларуса ў прыватнасці, перад аблічча шалёных узрушэнняў эпохі, гістарычных катастроф. Асаблівая метафорыка і глыбокі псіхалагізм у вершах-настроях З. Бядулі дазваляюць гаварыць пра выкарыстанне паэтам рэпертуарных мадэляў імпрэсіянізму, стварэнне нацыянальных узораў «пейзажаў душы».

Репозиторий БарГУ

**Спіс цытаваных крыніц**

1. *Луцкевіч, А.* Выбраныя творы: праблемы культуры, літаратуры і мастацтва / А. Луцкевіч ; уклад., прадм., камэнт., індэкс імёнаў, пер. з пол. і ням. А. Сідарэвіча. — Мінск : Кнігазбор, 2006. — 460 с.

2. *Казбярук, У. М.* Рамантычны пошук: назіранні над беларускім рамантызмам пачатку XX ст. / У. М. Казбярук. — Мінск : Навука і тэхніка, 1983. — 184 с.

3. *Калеснік, У. А.* Ветразі Адысея: У. Жылка і рамантычная традыцыя ў беларускай паэзіі / У. А. Калеснік. — Мінск : Маст. літ., 1977. — 328 с.

4. *Якуш, Н. М.* Эстэтыка мадэрнізму і традыцыя ў беларускай культуры пачатку XX ст. / Н. М. Якуш // Тр. БГТУ. Сер. 5 : Политология, философия, история, филология. — 2008. — № 5. — С. 120—122.

5. *Even-Zohar, I.* System, Dymanimcs, and Interference in Culture: A Synoptic View / I. Even-Zohar // Poetics today. — 1990. — № 11. — P. 85—94.

6. *Бядуля, З.* Збор твораў : у 5 т. / З. Бядуля. — Мінск : Маст. літ., 1989. — Т. 5 : Язэп Крушынскі : раман ; Сярэбраная табакерка : казка ; Публіцыстычныя артыкулы. — 519 с.

7. *Мельнікава, З. П.* Літаратура і эстэтыка нацыянальнага самапазнання ў філасофска-публіцыстычнай спадчыне Змітрака Бядулі / З. П. Мельнікава // Весн. Брэсц. ун-та. Сер. 3 : Філалогія. Педагогіка. Псіхалогія. — 2016. — № 1. — С. 5—13.

8. *Баршчэўскі, Л. П.* Словы ў часе: літаратура ад рамантызму да сімвалізму і нашаніўскага адраджэння / Л. П. Баршчэўскі, П. В. Васючэнка, М. А. Тычына. — СПб. : Неўс. прастор, 2014. — 369 с.

9. *Багдановіч, І.* Авангард і традыцыя: беларуская паэзія на хвалі нацыянальнага адраджэння / І. Багдановіч. — Мінск : Беларус. навука, 2001. — 387 с.

10. Тезисы к семиотическому изучению культур (в применении к славянским текстам) / В. В. Иванов [и др.] // Семиосфера / Ю. М. Лотман. — СПб. : Искусство-СПБ, 2000. — С. 504—525.

11. *Бядуля, З.* Збор твораў : у 5-ці т. / З. Бядуля. — Мінск : Маст. літ., 1985. — Т. 1 : Вершы, паэмы . — 407 с.

12. *Жураўлёў, В. П.* У пошуку духоўных ідэалаў: на матэрыяле беларускай літаратуры XIX — пач. XX ст. / В. П. Жураўлёва ; пад рэд. У. В. Гніламёдава. — Мінск : Беларус. навука, 2000. — 189 с.

13. *Мацюхіна, Т. Б.* Беларускі імпрэсіянізм / Т. Б. Мацюхіна. — Мінск : Беларус. навука, 2015. — 202 с.

Паступіў у рэдакцыю 29.11.2021.

Репозиторий БарГУ